УДК 070(091):947.6

В. У. Коваль, асістэнт (БДТУ)

# МІЖВАЕННАЯ ЭМІГРАЦЫЯ БЕЛАРУСКАГА І ЎКРАІНСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА Ў КАНАДУ

Канада была адной з асноўных краін эканамічнай эміграцыі з тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў міжваенны час. З 1918 па 1939 г. у Канаду эмігравала больш за 100 000 украінцаў з Заходняй Украіны і каля 15 000 беларусаў з тэрыторыі Заходняй Беларусі. Абсалютную большасць эмігрантаў канадскі ўрад засяліў у правінцыях Саскачэвані, Альберта, Манітоба і Квэбек. Канадскія міграцыйныя службы ўводзілі шэраг абмежаванняў для эміграцыі ў краіну. Дадзены артыкул абапіраецца на матэрыялы ўкраінскай эміграцыйнай перыёдыкі, беларускія і ўкраінскія сучасныя даследаванні.

Canada was one of the main destinations of emigration from Western Belarus and Western Ukraine in the period between the two world wars. In the period from 1918 till 1939 the number of emigrants from Western Ukraine to Canada was more than 100000 people, the number Belarusians from Western Belarus was about 15000 people. The absolute majority of emigrants were settled by Canadian government in the provinces – Saskatchewan, Alberta, Manitoba and Quebec. The number of emigrants coming to that country was determined to a great extent by the Canadian government`s immigration policy. This article is based on materials of Ukrainian diasporan press, Belarusian and Ukrainian modern researches.

**Уводзіны.** Адным з найбольш прыярытэтных напрамкаў эміграцыі ўкраінцаў і беларусаў паміж сусветнымі войнамі стала Канада. Пераезду ў дадзеную краіну спрыяла палітыка канадскага ўрада. Працяглы час улада Канады намагалася спрыяць фармаванню неабходнай эміграцыйнай кан’юнктуры, каб у дзяржаву ехалі працаваць лепшыя прадстаўнікі розных народаў са сваімі сем’ямі. Менавіта Канада стала адной з асноўных краін міжваеннай працоўнай эміграцыі беларусаў і ўкраінцаў. Эканамічная хваля беларускай і ўкраінскай эміграцыі таксама была накіравана ў Францыю, Германію, Аргенціну, ЗША, Бразілію, Парагвай, Уругвай, Бельгію і іншыя краіны свету.

**Асноўная частка.** Галоўнай прычынай украінскай і беларускай эміграцыі ў Канаду стала эканамічная. Людзі перасякалі акіян, каб палепшыць свае матэрыяльныя ўмовы, большасць беларусаў і ўкраінцаў ехалі з планамі наладзіць у Канадзе ўласную сельскагаспадарчую вытворчасць.

Магчымасць пераехаць у іншую краіну пражывання ў міжваенны перыяд заставалася ў жыхароў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, якія былі пад уладай Польшчы. Грамадзяне савецкай Беларусі фактычна былі пазбаўлены магчымасці масавай эміграцыі на Захад. Спрыяла эканамічнай хвалі эміграцыі з тэрыторый гэтак званых «усходніх крэсаў» пазіцыя польскага ўрада, накіраваная на палітычную, эканамічную і культурную дыскрымінацыю беларусаў і ўкраінцаў.

Масавая эміграцыя працаздольнага і здаровага насельніцтва ў Канаду была звязаная з шырокімі магчымасцямі рэгіёна. Шчыльнасць насельніцтва Канады на пачатку XX ст. была вельмі нізкай, таму ўрад краіны намагаўся праводзіць граматную палітыку перасялення, якая павінна была папоўніць дзяржаву лепшымі прадстаўнікамі розных народаў. Была створана сістэма, якая заканадаўча рэгулявала нацыянальнасць эмігрантаў, іх узрост, адукацыю, прафесію, стан здароўя і нават маральныя прынцыпы. Не дапускалася, каб у Канаду прыязджалі асобы, хворыя на туберкулёз, злачынцы, інваліды, алкаголікі і г. д. Асабліва старана адсочвалася, каб насельніцтва краіны не папаўнялася непісьменнымі эмігрантамі.

Развіццё беларускай і ўкраінскай дыяспары ў Канадзе падзяляецца на некалькі этапаў: 1) 1919–1925 гг.; 2) 1926–1930 гг.; 3) 1931–1935 гг.; 4) 1936–1939 гг. [1, с. 358]. Дадзеныя перыяды адрозніваюцца, перш наперш, інтэнсіўнасцю эміграцыйнага руху. Больш усяго з усходніх рэгіёнаў Польшчы ў Канаду выязджала жыхароў Галіччыны, Валыні і Палесся. 1920-я гг. – перыяд масавай эміграцыі з тэрыторый Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, з пачаткам 1930-х гг. лічба эмігрантаў значна паніжаецца.

Эканамічнае развіццё Канады на пачатку 1920-х гг., хуткі рост прамысловасці, будаўніцтва чыгункі вымагалі развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці. Урадам краіны было вырашана папоўніць колькасць сельскагаспадарчых рабочых з боку эмігрантаў. У Еўропу былі накіраваныя эмісары, мэтай якіх стала вывучэнне эміграцкіх магчымасцей дзяржаў.

Прыярытэтную групу першапачаткова для эміграцыі ў Канаду складалі англічане, немцы, французы, бельгійцы, галандцы, швейцарцы. Нягледзячы на спецыяльныя ўмовы для дадзеных народаў, гэта група эмігрантаў не прынесла чакаемых вынікаў. Большасць з іх разглядалі Канаду ў якасці часовай краіны пражывання, бо намагаліся праз пэўны час перасяліцца ў Злучаныя Штаты Амерыкі. Акрамя таго, часта прадстаўнікі прыярытэтнай групы не хацелі

займацца сельскагаспадарчай працай, таму пры першай жа магчымасці мянялі род заняткаў.

Ацаніўшы вынікі эміграцыйнай палітыкі Канады на пачатку 1920-х гг., урад краіны вырашыў арыентавацца на народы Усходняй і Цэнтральнай Еўропы. Са зменамі курса палітыкі Канады шырокія магчымасці для эміграцыі адкрываліся ў венграў, румынаў, палякаў, літоўцаў, латышоў, эстонцаў, чэхаў, славакаў, югаславаў, украінцаў і беларусаў.

Асаблівая ўвага была звернута на Польшчу. Канадскім урадам Польшча разглядалася як пераважна аграрная краіна, дзе было высокае перанасяленне вёскі. Разлік кіраўніцтва Канады сапраўды быў правільным, бо нямала сялян пачалі прадаваць сваю маёмасць і збірацца ў падарожжа. Людзі не бачылі перспектывы ў сябе на радзіме, таму лёгка пагаджаліся на пераезд. Цяжкае матэрыяльнае становішча сялян Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны паўплывала на высокі працэнт эміграцыі насельніцтва ў Канаду.

Беларусы, якія ехалі ў ЗША і Канаду, часта былі вымушаны хутка прадаваць сваю маёмасць і гаспадарку, каб аплаціць квіткі на карабель, дакументы і на дадзеныя грошы распачаць сваё жыццё за акіянам. Кошты на іх маёнткі агентамі часта збіваліся спецыяльна, бо не заўсёды ў гаспадароў было дастаткова часу для гандлю.

Пасля 1925 г. эміграцыя ў ЗША і Канаду ажыццяўлялася для грамадзян Польшчы толькі праз парты на Балтыйскім моры. Падарожжа ў Злучаныя Штаты і Канаду праз Гдыню ці Гданьск было нязручным для саміх эмігрантаў, але прыбытковым для польскай эканомікі. Мараплаўныя кампаніі таксама былі зацікаўленыя ў актыўнасці эміграцыі, бо гэта прыносіла ім грошы. Яны паўсюдна размяшчалі сваю рэкламу, праводзілі шырокую прапаганду сярод насельніцтва, распавядаючы пра забяспечанае жыццё за мяжой.

Павелічэнне колькасці эміграцыі ў Канаду можна патлумачыць яшчэ і зменамі заканадаўства ЗША ў міжваенны перыяд. Урад Амерыкі зрабіў усё магчымае, каб знізіць эміграцыю з Польшчы фактычна да мінімума. Некаторыя беларусы і ўкраінцы першапачаткова ехалі ў Канаду, каб праз пэўны час пераехаць у ЗША, што было значна прасцей, чым атрымаць дазвол з Польшчы і індывідуальную амерыканскую візу.

У 1921 г. у ЗША быў прыняты «закон Дзілінгхема», які ўвайшоў у гісторыю яшчэ пад назвай «закон квоты» (Quota Act), галоўнай ідэяй дакумента было ўстанаўленне штогадовага кантынгента эмігрантаў у ЗША [2, с. 307]. Сенатар Дзілінгхем прапанаваў унесці папраўку ў закон менавіта па дакладнаму абмежаванню колькасці эмігрантаў у ЗША. Квота для польскіх грамадзян складала 6524 асобы, аднак некаторыя групы маглі ехаць у Амерыку па-за квотамі. Гэты дакумент фактычна паклаў аснову юрыдычнаму абмежаванню эміграцыі ў Злучаных Штатах.

Пасля заканчэння тэрміну «закона Дзілінгхема» ў 1924 г. у ЗША быў прыняты новы дакумент, вядомы ў гісторыі як «закон Джонсана». Квоту для польскіх грамадзян паменшылі прыблізна ў пяць разоў. З 1929 г. на эміграцыйны працэс у ЗША пачаў аказваць уплыў сусветны эканамічны крызіс. З ростам беспрацоўя ў Амерыцы ўрад пачаў ствараць юрыдычныя перашкоды для магчымых новых эмігрантаў, нават распачалі мерапрыемствы па дэпартацыі тых, хто ўжо прыехаў, але не здолеў знайсці сабе працу. Разам з тым, колькасць беларусаў і ўкраінцаў, якія эмігравалі ў Злучаныя Штаты у міжваенны час, ужо была значна ніжэйшай за эміграцыю ў Канаду. Згодна з польскімі статыстычнымі дакументамі, маштабы міжваеннай беларускай эміграцыі ў Канаду былі прыблізна ў 15 разоў большымі, чым у Злучаныя Штаты Амерыкі.

Дакладна лічбы эмігрантаў у Канаду сярод беларускага і ўкраінскага насельніцтва ўстанавіць складана, бо некаторая частка сялян перапраўлялася праз акіян нелегальна. Можна пазначыць, што ў міжваенны час выехалі ў Канаду каля 15 000 беларусаў і не менш за 100 000 украінцаў, што склала прыблізна 70% усёй польскай эміграцыі ў гэты час [3, с. 188]. Неабходна адзначыць, што статыстыка эмігрантаў не падзяляе іх дакладна на нацыянальнасці. Падставай для даследавання колькасці беларусаў і ўкраінцаў, якія выехалі ў Канаду, з'яўляецца веравызнанне.

Большасць праваслаўных эмігрантаў былі беларусамі. Дапаўняе звесткі пра эміграцыю інфармацыя, з якога ваяводства Польшчы паходзілі новыя жыхары Канады. Польская статыстыка мае дакладныя звесткі пра колькасць праваслаўных эмігрантаў, рыма-каталікоў, грэка-каталікоў, пратэстантаў і іудзеяў. Пры даследаванні тэндэнцый і асаблівасцей беларускай дыяспары важна не адносіць да эміграцыі беларусаў яўрэйскае насельніцтва, якое пражывала на тэрыторыі Заходняй Беларусі і выехала за мяжу.

Прынцыповым пытаннем пры вывучэнні беларускай эміграцыі з'яўляецца яе сацыяльны склад. Колькасць інтэлігенцыі дыяспары непасрэдна ўплывала на палітычную, культурную і адукацыйную актыўнасць. Польская статыстыка дазваляе вылучыць тэндэнцыю, што «гандаль», «рамяство» і «вольныя прафесіі» за мяжой, як правіла, прадстаўлялі эмігранты з Польшчы, якія былі яўрэямі і палякамі па нацыянальнасці [4, с. 19]. Беларускія і ўкраінскія эмігранты пераважна з'яўляліся малазямельнымі сялянамі, якія ехалі за мяжу, каб уладкавацца там на цяжкую і малааплочваемую працу, аднак якая прыносіла большы прыбытак, чым гаспадарка на радзіме.

Эканамічны крызіс прымусіў урад Канады заканадаўча абмяжоўваць эміграцыю, дзе былі ўведзены таксама спецыяльныя квоты. Акрамя таго, ствараюцца законы, якія павінны былі прыпыніць эканамічную хвалю эміграцыі ў Канаду. Прыкладам абмежаванняў у канадскіх законах можа быць пастанова 1927 г., якая дакладна вызначала катэгорыю эмігрантаў: 1) узрост главы сям'і не павінен быць большым за 50 гадоў; 2) члены сям'і, старэйшыя за 18 гадоў, павінны працаваць толькі на сельскай гаспадарцы; 3) мужчыны, старэйшыя за 15 гадоў, павінны ўмець чытаць; 4) сем'і, якія аплачваюць свае карабельныя квіткі ў суме больш за 400 даляраў, могуць эміграваць без усялякіх абмежаванняў узросту і колькасці членаў сям'і [5, с. 354].

Сусветны эканамічны крызіс значна змяніў стаўленне да эміграцыі. Тая частка беларускага і ўкраінскага насельніцтва, якая прыехала ў Канаду ў 1929–1930 гг., апынулася ў вельмі складанай фінансавай сітуацыі. Яно адразу сустрэлася з праблемай голаду і беспрацоўя. У выніку крызісу колькасць эмігрантаў рэзка паменшылася ў 8–10 разоў.

Цяжкае матэрыяльнае становішча паўплывала на жыццё ўкраінскай і беларускай дыяспары ў міжваенны перыяд. Нямала тых, хто да 1929 г. ужо перайшлі працаваць і жыць у горад, былі вымушаны вярнуцца назад у сельскагаспадарчыя калоніі, часта да сваіх бацькоў [6, с. 418]. Глыбокі эканамічны крызіс пазбавіў працы нават моладзь дыяспары, якая ўладкавалася на працу ў буйных канадскіх гарадах.

Працэс сацыяльнай адаптацыі беларусаў і ўкраінцаў у Канадзе быў складаным. Новым жыхарам дзяржавы неабходна было засвоіць канадскую сістэму маральных каштоўнасцей, іншыя нормы паводзін у грамадстве і ўвесь час імкнуцца дамагчыся роўнасці ў сацыяльна-эканамічных правах. Асаблівую складанасць прадстаўляў індывідуалістычны спосаб жыцця, які не заўсёды правільна ўспрымаўся эмігрантамі. Акрамя таго, беларусам і ўкраінцам важна было як мага хутчэй засвоіць англійскую мову, канадскае заканадаўства, традыцыі новай радзімы, што часта было няпроста і патрабавала нямалых намаганняў і часу.

У міжваенны перыяд большасць эмігрантаў з Польскай дзяржавы займаліся земляробствам, у Канадзе былі створаны спецыяльныя сельскагаспадарчыя калоніі для эмігрантаў. Аднак засталіся звесткі, што ўкраінская дыяспара мела сваіх настаўнікаў, святароў, музыкантаў, адвакатаў, інжынераў, урачоў. Безумоўна, у больш колькаснай і кансалідаванай украінскай эміграцыі працэнт інтэлігенцыі быў значна вышэйшым. У беларусаў Канады адукаваных прадстаўнікоў амаль не было. Разам з тым, беларускія эмігранты часта звярталіся да ўкраінскіх спецыялістаў, іх яднала падабенства мовы і ментальнасцей народаў.

Большасць эмігрантаў з тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны з'яўляліся некваліфікаванай рабочай сілай, яны працавалі ў сельскай гаспадарцы, лясной прамысловасці ці займаліся рыбнай лоўляй. Што тычыцца дробнага бізнесу, вядома, што ўкраінцы станавіліся ўласнікамі гатэляў, матэляў, аўтамайстэрняў, крамаў, цырульняў і г. д. [7, с. 62]. Менавіта ў міжваенны час сярод прадстаўнікоў украінскай дыяспары ў Канадзе ўпершыню пачалі з'яўляцца пісьменнікі, журналісты, артысты і прафесары.

Беларуская эміграцыя паміж сусветнымі войнамі ў Канадзе адрознівалася палітычнай пасіўнасцю. Сапраўды, для эканамічнай эміграцыі, як правіла, характэрна слабая палітычная дзейнасць. Сярод тысяч беларусаў у Канадзе былі прасавецкія і нацыяналістычныя сілы, аднак колькасць удзельнікаў у палітычных партыях і грамадскіх арганізацыях вельмі невысокая.

Вядома, што некаторыя беларусы і ўкраінцы далучыліся да Камуністычнай партыі Канады, разам праводзілі агітацыю ў асяродку дыяспар, выпускалі газеты, ладзілі мерапрыемствы. Рускі аддзел быў створаны пры Канадскай лізе абароны рабочых, у 1930 г. распачаў сваю дзейнасць Рускі рабочы клуб імя М. Горкага ў Таронта [8, с. 55], дзе актыўна працавалі беларускія і ўкраінскія эмігранты.

Колькасць актыўных членаў дадзеных арганізацый невялікая, таму нельга весці гутарку пра шырокі ўдзел беларусаў і ўкраінцаў у дзейнасці прасавецкіх суполак. Таксама неабходна падкрэсліць, што няма дакументальных сведчанняў пра маштабную антысавецкую працу беларускай дыяспары. На сённяшні дзень некаторыя беларускія эмігранты ЗША і Канады намагаюцца завысіць ролю палітычнай дзейнасці беларускага грамадства за мяжой. Іх пазіцыі і меркаванні не пацвярджаюцца матэрыяламі гістарычных крыніц па дадзенаму перыяду.

Палітычная актыўнасць украінцаў была значна вышэйшая, што можна патлумачыць большым працэнтам інтэлігенцыі ў асяродку ўкраінскай дыяспары. У краінах, дзе пражывала ўкраінская эміграцыя ў міжваенны час, інфармацыю пра радзіму можна было атрымаць з лістоў сваякоў ці перыядычных выданняў дыяспары.

Колькасць украінскіх газет і часопісаў у Канадзе была значна большай, чым у беларусаў. У бібліяграфіі В. Кіпеля і З. Кіпель «Беларускі друк на Захадзе» ёсць інфармацыя, што ў Таронта выйшаў адзін нумар часопіса беларускіх эмігрантаў на рускай мове пад назвай «Канадскі Гудок» [9, с. 658]. Экземпляраў часо-

піса ў беларускіх бібліятэках і архівах няма. Невядома, ці захавалася выданне ў замежных калекцыях прэсы беларускай дыяспары, аднак шырокае выкарыстанне сучаснымі гісторыкамі часопіс «Канадскі Гудок» не атрымаў у даследаваннях па эміграцыі.

Слаба пашыраны беларускі перыядычны друк не дазваляў эмігрантам атрымоўваць інфармацыю пра палітычныя, эканамічныя і культурныя падзеі на радзіме, таму часта беларусы станавіліся чытачамі ўкраінскай прэсы дыяспары. Спецыяльна для беларусаў некаторыя найбольш пашыраныя ўкраінскія выданні спрабавалі на старонках сваіх нумароў уводзіць беларускую рубрыку, аднак часта ніякіх водгукаў на яе не паступала.

Інфармацыя пра жыццё і дзейнасць беларусаў публікавалася ў эмігранцкай украінскай прэсе. Прыкладам такіх артыкулаў можа быць матэрыял «Палякі і беларусы», надрукаваны ў газеце «Новы шлях» (Саскатун, Канада). У артыкуле адзначаецца, што польскія ўрадавыя чыноўнікі ў Вільне па загаду Варшавы пачалі пераследаваць палітычных дзеячаў Усходняй Польшчы за праведзеную разам з украінцамі тайную канферэнцыю, на якой абмяркоўвалася барацьба за незалежнасць беларусаў і ўкраінцаў. Аўтар матэрыялу (без подпісу) прыходзіць да высноў: «Зараз беларусы зноў пачалі акцыю і іх нацыянальная самасвядомасць заўважна павялічваецца, асабліва ва Усходняй Польшчы» [10, с. 1]. Дадзеным артыкулам украінцы прадэманстравалі сваю салідарнасць, выказалі падтрымку і падкрэслілі зацікаўленасць беларускімі праблемамі ва Усходняй Польшчы. Газета змяшчае інфармацыю пра падзеі ў Заходняй Беларусі, бо была разлічана не толькі на ўкраінскіх чытачоў, але і на беларускіх.

Інфармацыя пра дзейнасць беларускай эміграцыі публікавалася не толькі на старонках перыядычных выданняў украінскай дыяспары, але і ў нумарах заходнеўкраінскай прэсы. Напрыклад, 15 лютага 1931 г. газета «Діло» распавядала пра масавыя маніфестацыі ўкраінскай эміграцыі ў ЗША, Канадзе, Бразіліі і Аргенціне супраць жорсткага тэрору ва Усходняй Галічыне, у якіх прымалі таксама ўдзел і беларусы [11, с. 143]. Такім чынам, выдаўцы ўкраінскіх газет і часопісаў публікавалі матэрыялы пра беларусаў не толькі дзеля інфармацыйнай падтрымкі, але і для актывізацыі палітычнага жыцця беларусаў замежжа.

**Заключэнне.** Такім чынам, беларуская міжваенная эміграцыя ў Канадзе была, у асноўным, эканамічнай, большасць эмігрантаў паходзілі з тэрыторыі Заходняй Беларусі, якая знаходзілася пад уладай Польшчы. Беларуска-ўкраінскія кантакты дапамагалі складанаму працэсу сацыяльнай адаптацыі беларускіх эмігрантаў. Украінская дыяспара рабіла непасрэдны ўплыў на палітычную, культурную і эканамічную дзейнасць беларускага грамадства за мяжой, пра што сведчыць перыядычны друк эмігрантаў.

**Літаратура**

1. Качараба, С. П. Трудова еміграція іх Західної України в Канаду (1919–1939) / С. П. Качараба // Вісник Львівського університету. – Львів: Львівський національний університет імені Івана Франка, 2002. – Вип. 37. – Ч. 1. – С. 350–363 (Сер. істор).

2. Качараба, С. П. Від свободи імміграції до реструкціонізму: вплив законодавства США на українську еміграцію наприкінці XIX – у першій третині XX століття / С. П. Качараба // Вісник Львівського університету. – Львів: Львівський національний університет імені Івана Франка. – Вип. 39–40. – 2005. – С. 300–313. (Серія істор.)

3. Качараба, С. П. Еміграція з Заходної України 1919–1939 / С. П. Качараба. – Львів: Львівський національний університет імені Івана Франка, 2003. – 416 с.

4. Шваб, А. Г. Еміграція з Волині 1921–1939 рр.: автореф. …дис. канд. істор. наук: 07.00.01 – історія України / А. Г. Шваб. – Чернівці: Волинськії державні університет ім. Лесі Українки, 1996. – 23 с.

5. Качараба, С. П. Трудова еміграція іх Західної України в Канаду (1919–1939) / С. П. Качараба // Вісник Львівського університету. – Львів. – Вип. 37. – 2002. – Ч. 1. – С. 350–363 (Сер. істор).

6. Макарчук, С. А. Етнічна історія України / С. А. Макарчук. – Київ: Знання, 2008. – 471 с.

7. Сич, О. Сфери трудової діяльності української еміграції в Канаді в міжвоєнній період / О. Сич // Українська діаспора. – Київ: Інтел, 1994. – Ч. 5. – С. 58–65.

8. Семенова, Л. Н. Страницы истории белорусской диаспоры в Канаде в первой половине XX в. / Л. Н. Семенова // Иппокрена: Институт парламентаризма и предпринимательства. – Минск, 2007. – С. 51–58.

9. Кіпель, В. Беларускі друк на Захадзе: бібліяграфія / В. Кіпель, З. Кіпель. – Нью-Йорк; Варшава: Belarusian Institute of Arts and Science, 2006. – 841 с.

10. Поляки й Білорусини // Новий шлях. – Саскатун, Канада. – 1939. – № 7. – С. 1.

11. Сливка, Ю. Суспільно-політичне життя українців Канади в дзеркалі західноукраїнської преси (20–30-ті роки) / Ю. Слівка // Українська еміграція. Історія і сучасність: матеріали Міжнар. наук. конф., присвечених 100-річчю еміграції українців до Канади. – Львів: Каменяр, 1992. – С. 140–153.

*Паступіў 02.04.2010*